Славутыя суайчыннікі

# НАДЗЕЯ ЛЕЖЭ: ФРАНЦУЗСКІ ЛЁС БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЧКІ



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар

**У невялікім аграгарадку Зембін, што ў Барысаўскім раёне, ёсць уласная карцінная галерэя, багаццю калекцыі якой могуць пазайздросціць большасць райцэнтраў. Пачатак гэтай выбітнай калекцыі паклала сваім дарам славутая зямлячка зембінцаў – Надзея Хадасевіч-Лежэ, жанчына дзівоснага лёсу і яркага таленту.**

## Малявала ўсё і на ўсім

Бацькі Надзеі Хадасевіч-Лежэ – карэнныя беларусы. Абодва нарадзіліся на Барысаўшчыне і тут закончылі сваё зямное жыццё – у пасёлку Зембін, на малой радзіме маці мастачкі, Марыі. Бацька Пётр Хадасевіч таксама тутэйшы, з вёскі Мужанка. Сям'я Хадасевічаў была беднай і шматдзетнай. Бацька працаваў «сядзельцам» – прадаўцом гарэлкі ў казённай лаўцы.

Сярод сваіх братоў і сясцёр маленькая Надзя вылучалася незвычайнай прагай да малявання. Малявала яна ўсё і на ўсім, што траплялася пад руку. Пазней аб сваім захапленні Надзея Лежэ напіша так: «Што галоднаму скіба хлеба, што замёрзламу дровы ў палаючай печцы было для мяне маляванне. А ўсё астатняе ў імгле» [2, с. 21]. Аднак бацькі не надавалі здольнасцям дачкі асаблівай увагі. Надзею ж жаданне навучыцца майстэрству жывапісу з цягам часу запаланіла цалкам. У адной з газет яна прачытала пра горад мастакоў Парыж.



З таго часу мара трапіць у Парыж не пакідала дзяўчынку ні днём, ні ноччу. Некалькі разоў Надзя нават збягала з дому з мэтай самастойна дабрацца да горада сваёй мары, але кожны раз яе знаходзілі ў якім-небудзь цягніку і вярталі дамоў.

Першая сусветная вайна рэзка змяніла больш-менш усталяваны лад жыцця Хадасевічаў. Барысаўшчына ператварылася ў прыфрантавую зону, і многія жыхары вымушаны былі пакінуць яе. Сярод бежанцаў аказалася і сям'я Надзеі. У ваенны час Хадасевічы знайшлі прытулак у гарадку Бялёў Тульскай вобласці. Да радасці Надзі ў Бялёве меўся Дом мастацтваў.

## Першыя крокі да мары

Менавіта ад кіраўніка гуртка малявання дзяўчынка пачула аб існаванні ў горадзе Смаленску Вышэйшых дзяржаўных мастацкіх майстэрань «Свамас» («Свабоднае мастацтва»), дзе выкладаюць вядомыя мастакі. Надзея вырашыла ўжо выпрабаваным спосабам – уцячы з дому – дабрацца да Смаленска. На гэты раз план пятнаццацігадовай уцякачкі быў рэалізаваны. Дабраўшыся да горада, яна пасялілася на вакзале ў старым вагоне. Каб зарабіць на ежу, мыла бялізну і падлогі, пераносіла пасажырам багаж.

На ўступных экзаменах Надзея ўразіла камісію жудаснай недасведчанасцю ў мастацтве (да 15 гадоў дзяўчынка не бачыла ніводнай карціны і не была ніколі ў музеі) і сапраўдным талентам да малявання. У выніку Надзею прымаюць у Майстэрні. Там яна ўпарта працуе, засвойвае прынцыпы «новага мастацтва», палкім прапагандыстам якога з'яўляецца выкладчык, аўтар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

славутага «Чорнага квадрата» Казімір Севярынавіч Малевіч. Аднак яго прапаведзь «канца мастацтва» выклікае ў Надзеі адчуванне прафесійнай разгубленасці. Веру ў неабходнасць людзям справы, якой яна збіраецца прысвяціць жыццё, дзяўчыне вяртае артыкул французскага мастака Фернана Лежэ. У артыкуле сцвярджалася, што мастацтва – вечнае. Перакананы авангардыст, Лежэ адстойваў права на эксперымент у мастацтве і сцвярджаў, што за новымі мастацкімі формамі – будучыня [3]. І цяпер Надзея ўжо цвёрда вырашыла дабрацца да Парыжа і пастарацца стаць вучаніцай Фернана Лежэ.



Вядома, трапіць у Еўропу было вельмі складана. І Надзея вырашае скарыстаць сваё палажэнне бежанкі. Справа ў тым, што ў 1920 г. Заходняя Беларусь была акупіравана Польшчай. Згодна з дамовай паміж Польшчай і РСФСР беларусам, якія падчас Першай сусветнай вайны пакінулі гэтыя тэрыторыі, дазвалялася вярнуцца ў свае вёскі. Аднак едзе Надзея Хадасевіч не ў Зембін, а ў Варшаву. І адразу накіроўваецца ў Акадэмію мастацтваў. Прадстаўленыя дзяўчынай малюнкі так спадабаліся педагогам, што яе без іспытаў у 1922 г. прымаюць у Акадэмію.

У Акадэміі мастацтваў Надзея Хадасевіч знаёміцца са студэнтам Станіславам Грабоўскім, сваім аднагодкам, сынам заможнага варшаўскага чыноўніка. Агульныя духоўныя каштоўнасці, агульнае захапленне новым мастацтвам паступова перараслі ў каханне. Нягледзячы на забарону бацькоў Станіслава, маладыя людзі пабраліся шлюбам. Аднак уладкаваць сямейнае жыццё па ўласным меркаванні ў доме старэйшых Грабоўскіх Надзеі і Станіславу не ўдалося. І маладая жонка прапаноўвае мужу пакінуць Варшаву і накіравацца ў Парыж.

## У майстэрні Фернана Лежэ

Надзея і Станіслаў напісалі ліст Фернану Лежэ і папрасілі прыняць іх у Акадэмію сучаснага мастацтва, якую ён узначальваў, абгрунтаваўшы сваю просьбу імкненнем «засвоіць прыёмы адлюстравання рэальнасці, незалежныя ад умоўных эстэтычных норм і сацыяльных абмежаванняў». Неўзабаве французскі мастак прыслаў абодвум запрашэнні ў Парыж. Узрушаныя згодай сусветна вядомага авангардыста, Надзея і Станіслаў скіраваліся ў тагачасную «Мекку мастацтваў».

Маладыя мастакі былі зачараваныя сталіцай Францыі, прыёмам, аказаным мэтрам Лежэ, яго экспрэсіўнымі кампазіцыямі. Надзея і Станіслаў з энтузіязмам пачалі спасцігаць мову авангарднага жывапісу ў Акадэміі сучаснага мастацтва. Пэўны час майстар не звяртаў асаблівай увагі на творчасць маладой беларускі, але Надзея шмат і апантана працавала. Лежэ пачаў часцей спыняцца каля яе мальберта, даваў парады, размаўляў з таленавітай вучаніцай. Год ад году творы Надзеі станавіліся больш самастойнымі і выразнымі. Фернан Лежэ прапанаваў ёй пасаду асістэнткі ў Акадэміі сучаснага мастацтва.

А вось сямейнае жыццё Надзеі і Станіслава ў Парыжы не заладзілася. Нават нараджэнне дачкі Ванды не ўтрымала іх ад скасавання шлюбу. Станіслаў вярнуўся ў Польшчу, Надзея з дачкой засталася ў Парыжы.

З пачаткам Другой сусветнай вайны многія французскія дзеячы мастацтваў пакінулі краіну. Сярод іх быў і Фернан Лежэ. Ад'язджаючы ў Амерыку, паклікаў з сабой і Надзею, але яна вырашыла застацца ў акупіраваным немцамі Парыжы. Мастачка стала актыўнай удзельніцай французскага Супраціўлення, чатыры гады, рызыкуючы жыццём, дапамагала партызанам і савецкім ваеннапалонным. В 1944 г. Надзея ўступіла ў Саюз савецкіх патрыётаў і Саюз дапамогі былым ваеннапалонным. Яна арганізоўвала дабрачынныя аўкцыёны жывапісу, у якіх удзельнічала сама са сваімі карцінамі і пераконвала ўдзельнічаць знакамітых тагачасных еўрапейскіх мастакоў. Атрыманыя ад продажу твораў сродкі ішлі на падтрымку ваеннапалонных і дэпартаваных асоб [2].

Пасля заканчэння вайны ў Францыю вярнуўся Фернан Лежэ. З яго прыездам аднавіліся заняткі ў Акадэміі сучаснага мастацтва. Лежэ запрасіў Надзею выкладаць там малюнак. Педагагічную дзейнасць мастачка спалучала з актыўнай творчай. Яе талент ярка праявіўся не толькі ў жывапісе, але таксама ў графіцы і мазаіцы. Паступова мастачка Хадасевіч набывала еўрапейскую вядомасць. А творчыя стасункі з Фернанам Лежэ перараслі ў шчырыя сардэчныя пачуцці. У 1952 г. сямідзесяцігадовы мастак і яго пяцідзесяцігадовая вучаніца пабраліся шлюбам.

Пасля вяселля муж і жонка Лежэ пераехалі ў прыгарад Парыжа Жыф-сюр-Івет. Ва ўтульным асабняку яны стварылі дзве майстэрні: на першым – для Фернана, на другім – для Надзеі. Яна не жадала працаваць побач з мужам, каб не страціць





РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР

уласны стыль, не паддацца ўплыву славутага мастака. За мальбертам Надзея любіла спяваць пабеларуску, а Фернан, працуючы, натхняўся ад яе спеваў. Калі ж спевы спыняліся, Фернан стукаў у стол, каб Надзея працягвала працаваць і спяваць. Гэта быў сапраўды плённы і шчаслівы перыяд для абодвух мастакоў. Але доўжыўся ён усяго тры гады. 17 жніўня 1955 года Фернана Лежэ не стала [7].

## Творчая спадчына майстра

Надзея стала адзінай уладальніцай усёй творчай спадчыны знакамітага мастака. Памяць мужа і настаўніка яна вырашыла ўшанаваць, стварыўшы ў маёнтку Лежэ ў Біёце музей. Праект будынка зрабіў французскі архітэктар з рускімі каранямі Андрэ Свечын. У лютым 1957 г. быў закладзены першы камень у падмурак будучага музея, а ў 1960 г. будаўніцтва было завершана. Сёння гэта адзін з найбольш маляўнічых музеяў Францыі. Яго фасад упрыгожвае вялізная керамічная мазаіка. У ім захоўваецца найбуйнейшая ў свеце калекцыя твораў Ф. Лежэ: малюнкі, мазаіка, вырабы з бронзы, керамікі, габелены. Асобны раздзел тут займаюць работы самой Надзеі Пятроўны. Сярод іх – мазаічныя партрэты Ю. Гагарына, У. Маякоўскага, Л. Талстога, П. Чайкоўскага. Надзея абсталёўвае і Музейферму Лежэ ў вёсцы Лізор, у Нармандыі, на радзіме мастака.

У 1967 г. жонка мастака перадала музей у Біёце ў дар Францыі, праз дзесяць гадоў музею быў нададзены статус нацыянальнага. Надзея Пятроўна засталася яго пажыццёвай апякункай.

## Зноў на радзіме

Падчас сумеснай творчай дзейнасці Надзея Пятроўна шмат і з захапленнем распавядала мужу пра Беларусь. Яны марылі разам паехаць туды, пазнаёміць суайчыннікаў Надзеі са сваёй творчасцю. Сумесная паездка, на жаль, не адбылася. Задуму аб арганізацыі выстаў Фернана Лежэ ў СССР давялося ажыццяўляць адной Надзеі. Падчас «халоднай вайны» гэта было надзвычай складана. Надзя Лежэ становіцца сапраўдным дыпламатам ад мастацтва, знаходзіць узаемаразуменне з тагачасным міністрам культуры СССР К. Фурцавай. А з такімі выдатнымі дзеячамі савецкай культуры, як М. Плісецкая, В. Сярова, К. Сіманаў, М. Чаркасаў, Д. Шастаковіч, Р. Шчадрын, І. Эрэнбург, С. Юткевіч, у яе завязалася сапраўднае сяброўства. Усё гэта дапамагло Надзеі не толькі наладзіць у шэрагу гарадоў Савецкага Саюза выставы твораў Фернана Лежэ і сваіх уласных, але і актыўна спрыяць прэзентацыі дасягненняў савецкіх мастакоў у Францыі. Частку сваіх мастацкіх прац Надзея Пятроўна ў 1972 г. падарыла Савецкаму Саюзу. У падмаскоўным горадку Дубна была арганізавана іх выстава, а частка мазаічных партрэтаў устаноўлена каля гарадскога Дома культуры. Ёсць творы Надзеі Лежэ і ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі [8]. За значны ўклад у развіццё савецка-французскага культурнага дыялогу Н. П. Лежэ ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У 1959 г. Надзея Пятроўна прыехала ў вёску Зембін, дзе прайшло яе дзяцінства. Ні сваякоў, ні знаёмых там ужо не засталося. З сумам пакідала мастачка родныя мясціны, а падчас наступнага візіту ў Беларусь падарыла сваім землякам тры дзясяткі выдатна выкананых рэпрадукцый твораў заходнееўрапейскіх мастакоў: Веласкеса, Ван Гога, Гагена, Э. Манэ, К. Манэ, Пісаро, Рэнуара і інш. Акрамя іх, у Зембін наша знакамітая суайчынніца прывезла шэсць уласных мазаічных пано. Доўгі час рэпрадукцыі і пано аздаблялі памяшканне Зембінскай школы, а ў 1988 г. было вырашана на іх базе стварыць у Зембіне карцінную галерэю.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Бокье, Ж.** Надежда Леже. Фернан Леже: каталог выставки / Ж. Бокье. – М.: Министерство культуры СССР, 1963. – 114 с.
2. **Дубенская, Л. А.** Рассказывает Надя Леже / Л. А. Дубенская. – М.: Детская литература, 1978. – 288 с.
3. **Живопись. Фернан Леже** [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://artifex.ru.– Дата доступа: 18.02.2019.
4. **Жуковская, О.** История Зембинского музея Народной славы началась с Надежды Леже / О. Жуковская // Адзінства. – 2015. – 1 ліпеня. – С. 10.
5. **Малевич, К.** Бог не скинут. Искусство, церковь, фабрика / К. Малевич // Собр. соч.: в 5 т. – М.: Гилея, 1995. – Т. 1. – С. 236–265.
6. **Ходосевич-Леже, Н. П.** Письма Надежды Ходосевич-Леже к министру культуры СССР Е. А. Фурцевой // Культурологические записки: сб. ст. / Институт искусствоведения. – Вып. 6: Художественная жизнь России 1970-х. – М., 2000. – С. 318–327.
7. **Coulondre, A.** Musee national Fernand Leger, Biot / guide de visite / A. Coulondre, D. Gay, N. Maillard. – De Musee national Fernand Leger, 1992. – 64 p.
8. **Leger, N.** Mosaiques monumentales portraits / N. Leger, A. Verdet. – Paris: Theatre 71 / Malakoff, 1972. – 19 p.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ